# “Калісь глядзеў на сонца я...”

## Галерэя партрэтных вобразаў да 135-годдзя Максіма Багдановіча



***Рыгор Таболіч*. Маці паэта.**

1981 г. Палатно, алей.

*Літаратурны музей Максіма Багдановіча.*

# РЭЧЫ І ГІСТОРЫІ

ДА 135-ГОДДЗЯ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

## МАМІНА СКАРБОНКА

### ЛІСТЫ МАРЫІ І АДАМА БАГДАНОВІЧАЎ

Мемарыяльныя рэчы Багдановічаў прадстаўлены не толькі ў мінскім музеі паэта. У 1969 г. Аўгуста Іванаўна Багдановіч (жонка Паўла Адамавіча – адзінакроўнага брата Максіма) перадала пісьменніку Аляксею Карпюку некалькі сямейных рэліквій, якія папоўнілі фонды Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. Сярод іх – прыгожая скарбонка ў японскім стылі.

Гэты музейны прадмет мае задакументаваную гісторыю, бо неаднойчы згадваецца ў эпісталярыі бацькоў Максіма. У красавіку – ліпені 1895 г. Марыя Апанасаўна з сынамі гасцявала ў сваёй сястры Стэфы ў вёсцы Вяззе пад Асіповічамі. Пра побыт у сваякоў і пра падарунак мы ведаем з падрабязных лістоў Марыі і Адама: «*Ты конечно догадалась, что ящик этот предназначен тебе в презент: ты ведь чувствуешь к ним "влечение род недуга"; вот я и захотел угодить тебе. Видишь, что в твоем отсутствии я становлюсь нежнее. Ножик тебе в придачу. Оно уже немного жирновато, ну да уже куда ни шло. Но что будет, когда ты потеряешь ключик? У тебя ведь к этому особая способность*».

Пасля атрымання пасылкі Марыя Апанасаўна напісала: "*Дороженький мой, любенький, лучший на всем свете Адамонька, солнышко мой золотое, за что ты меня так балуешь? Я сейчас только получила все, чего желала, и теперь нахожусь в таком возбужденном состоянии, что не знаю о чем писать, с чего начать. Шкатулочка такая прелесть, что даже Стефа заскучала как увидела ее; ножичка своего собственного я даже не чаяла иметь. Дети все, и мои, и Стефины, тоже скачут в восторге от лакомств; я им четверым дала по одной серебряной копеечке, и они вот уже полчаса сидят все вместе и рассуждают, что купит каждый из них на свои деньги*".

У гэты ж дзень 13 мая 1895 г., не паспеўшы атрымаць ліст з Вяззя, Адам Ягоравіч пісаў: "*Посылаю тебе, моя дорогая, лекарств, термометр, капельницу і 3 руб. денег. Смотри же, чтобы с термометром не было того же, что с двумя предыдущими. Карболку, термометр и другие лекарства держи в своей шкатулке под замком, с тем, однако, чтобы не потерять ключик…*"

ДА ГОДА БЕЛАРУСКАЙ ЖАНЧЫНЫ



**Скарбонка з інкрустацыяй Марыі Багдановіч** (КП 092959/68). *Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей.*

Ці згубіўся арыгінальны ключык у Вяззі, ці пазней, мы не ведаем, але ён сапраўды да нашага часу не збярогся. Праўда, і без яго скарбонка яшчэ доўга служыла сямейнай рэліквіяй. Пісьменнік і даследчык жыцця і творчасці Максіма Багдановіча Алесь Бачыла ўспамінаў, што менавіта ў ёй нашчадкі захоўвалі найбольш важную частку сямейнага архіва і лісты, якія так шмат апавялі нам пра сям'ю Максіма, быццам здзяйсняючы задумку Марыі Апанасаўны: "*Все твои письма сейчас же при прочтении они требуют себе поочередно, так как это папка им пишет письма, и мне стоит большого труда отстоять свою собственность, я их решила собирать и прятать в своей шкатулке, ты в них вылился весь с твоей добротой и заботливостью о семье. Детки вырастут и узнают какой у них был папка*" [22 мая 1895 г.].

Лісты вельмі пяшчотныя, а таксама інфармацыйныя. З іх мы даведваемся пра адносіны ў сям'і, узаемны клопат і безліч побытавых дэталяў.

Скарбонка выдатна дапаўняе аднолены інтэр'ер "Пакоя маці" музея Максіма Багдановіча ў Гродне. Прыгожы напамінак пра бясклапотнае дзяцінства вялікага паэта і яго сям'ю. Скарбонка, якая сама па сабе скарб.

**Міхась БАРАНОЎСКІ,**
загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.